Назва ТВП: Пойма Заходняй Бярэзіны

© С. Левый

Код: BY007

Геаграфічныя каардынаты: 53° 50' N 26° 06' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Гродзенская вобласць: Іўеўскі раён, Навагрудскі раён

Плошча: 8031 га

Крытэрыі: B2

Нацыянальны прыродаахоўны статус: не мае

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП рэгіянальнай значнасці

Агульнае апісанне:

ТВП размешчана ў цэнтральнай частцы Беларусі ў 20 км на паўночны усход ад горада Асіповічы. Уяўляе сабой буйны цэласны лясны масіў у міжрэчча Свіслачы і Бярэзіны, які захаваўся ў натуральным стане. З паўднёвага-усходу абмяжоўваецца рэчышчам р. Ольса (левы прыток р. Бярэзіна).

Асноўнай воднай артэрыяй з'яўляецца рака Западная Бярэзіна. Правы прыток Нёмана, агульная даўжыня 226 км, на тэрыторыі заказніка каля 40 км. Лясістасць вадазбору каля 29%, пераважаюць хваёвыя лясы, забалочана меньш за 20 %. Даліна ракі шырынёй ад 500 м да 3 км. Берагі стромкія, вышынёй 1-2 м, складзены пераважна пяскамі, пакрыты лесам. Пойма двухбаковая шырынёй ад 0,3 да 3 км,

нізінная, роўная, лугавая, на вялікім працягу забалочана, пакрытая лесам, месцамі парослая рэдкім хмызняком, штогод затапляеца. Рэчышча слабазвілістае, шырынёй у сярэднім цячэнні і ў нізоўі да 10-30 м. Узроўневы рэжым нестабільны і характарызуецца хуткім уздымам у перыяд вясновай паводкі, павольным спадам і вялікімі амплітудамі вагання (у сярэднім 3,5 м, максімальная да 4,3 м).

ТВП Заходняя Бярэзіна таксама ўключае лугі ў пойме р. Нёман каля весак Любча і Дзяляцічы.

Гаспадарчае выкарыстанне: лясная і сельская гаспадарка; сельскагаспадарчыя ўгоддзі прадстаўленыя, галоўным чынам, сенажацямі і пашамі. Прамысловыя прадпрыемствы і населеныя пункты адсутнічаюць.

Асноўныя біятопы:

Лясы – 30%, рэкі і іх узбярэжжы – 3%, лугі – 35%, сяльгасугоддзі – 30%, населеныя пункты – 2%.

Птушкі:

На тэррыторыі ТВП, дзякуючы наяўнасці высокіх пясчаных берагоў на р. Заходняя Бярэзіна штогод гняздзіцца значная колькасць звычайнага зімародка *Alcedo atthis*. ТВП мае рэгіянальнае значэнне і створана менавіта для захавання гэтага віда.

Іншыя групы жывел:

не вядома.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Звычайны зімародак *Alcedo atthis*	гн	20-35 п	2005	Э	↔	В2

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

не вядома.

Пагрозы:

Даследаваны не дастаткова.

Рэкамендацыі па захаванню:

Неабходна дадатковае даследванне тэррыторыі ТВП з мэтай стварэння біялагічнага заказніка мясцовага значэння.

Крыніцы інфармацыі:

Блакітная кніга Беларусі (Водныя аб'екты Беларусі). Энцыклапедыя. Мінск, 1994.

Складальнікі : Левы С.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*